ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 СНЕЖНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 235 (28851)

Кірмаш ідэй

Кірмаш інавацыйных ідэй Smart Patent 2018 праходзіў у сталіцы на працягу двух дзён. У Палацы мастацтва былі прэзентаваныя найлепшыя наватарскія ідэі і распрацоўкі айчынных кампаній і груп, прайшлі прафесійныя семінары.

Фота БелТА.

Удзельнік кірмашу Сяргей НІКІТКІН назірае за працэсам 3D-друку.

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 10 тысяч білетаў

на II Еўрапейскія гульні ўжо знайшлі сваіх уладальнікаў у першыя дні продажаў. Найбольшым попытам карыстаюцца білеты на спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, мастацкай гімнастыцы, веласіпедным спорце на шашы, а таксама на цырымоніі адкрыцця і закрыцця. Жыхары любой краіны могуць аформіць свае білеты ў яркае лета самастойна праз сайт www.minsk2019.ticketpro.by. У Беларусі іх можна таксама набыць у касах сеткі афіцыйнага білетнага аператара — кампаніі «Тыкетпро», а ў Еўропе — праз афіцыйных рэсэлераў. Кошт білетаў на спаборніцтвы ад Br5, або 2 еўра (для замежных грамадзян), да Br50, або, адпаведна, 20 еўра. На цырымонію адкрыцця цана вар'іруецца ад Br150 да Br300 у залежнасці ад катэгорыі месца. Цэны білетаў на цырымонію закрыцця крыху ніжэйшыя — ад Br70 да Br150.

КОРАТКА

- **Грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых тэрміновай службы ў Беларусі з 1 студзеня ўзрасце больш чым у два разы.**
- У краіне за 9 месяцаў бягучага года продаж новых аўтамабіляў вырас на 62 % у параўнанні з папярэднім годам.



- **У Брэсцкай вобласці тэсціруюць мабільную праграму, якая папярэджвае аб небяспецы паблізу чыгункі.**
- Колькасць крамаў у Беларусі ў студзені — верасні вырасла на 5,5 %, інтэрнэт-крамаў — на 14,8 %.
- **У Віцебску завяршаецца будаўніцтва Цэнтра па скачках на батуце.**

ISSN 1990 - 763X

Трэці ўзрост

«Дзеці і ўнукі ў захапленні ад маіх карцін!»

У Мінску прайшоў арт-фестываль «Дыялог ±60» з удзелам пажылых і маладых

«Сфатаграфуйце мяне на фоне гэтай карціны, калі ласка! — папрасіла мяне прыемная пажылая жанчына. — Мы яе ўсе разам малявалі. І ад душы пры гэтым весяліліся!»

СТАР. 13

Выстава карцін людзей трэцяга ўзросту.

Камунальныя стасункі

ПА ВЫЯЎЛЯЛЬНЫМ І ЗАЯЎЛЯЛЬНЫМ ПРЫНЦЫПЕ

Сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый пашырана

Спецыялісты сістэмы ЖКГ расказалі, хто можа прэтэндаваць на частковую аплату жыллёва-камунальных паслуг.

Па словах **намесніка начальніка жыллёва-камунальнага аддзела філіяла «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр Мінска» Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама Ганны БЕЛЬСКАЙ,** згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі № 225, права на безнаяўныя жыллёвыя субсідыі атрымалі **па выяўляльным прынцыпе** мамы (альбо іншыя асобы), якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў і якім выплачваюць адпаведныя дапамогі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Таксама грамадзяне, якія атрымліваюць дапамогу па доглядзе за інвалідам I групы або пажылым пасля васьмідзесяцігадовага ўзросту.

Субсідыя гэтым людзям будзе выдзяляцца на падставе баз даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, ніякіх даведак і дакументаў збіраць не трэба.

Акрамя таго, **па заяўляльным прынцыпе** звяртацца па субсідыю змогуць грамадзяне або сем'і, якія не маюць уласнага жылля і пражываюць на здымных кватэрах альбо ў інтэрнаце прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Асноўная ўмова, як і раней, — штомесячная сума платы за жыллёва-камунальныя паслугі пры нарматыўным іх спажыванні не павінна перавышаць 20 % сярэднямесячнага сукупнага даходу сям'і ў горадзе і 15 % — на вёсцы.

СТАР. 2